Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАПОЎНЫХ

26 (7206) | Субота, 17 сакавіка 1944 г. | Цана 20 кап.

2.
ВСЕСОЮЗНАЯ БИБЛИОТЕКА имени В. И. ЛЕНИНА

Хутчэй завяршыць падрыхтоўку да сяўбы

Надыходзіць адзін з адказнейшых момантаў у жыцці калгасаў, соўгасаў і МТС. Блізіцца пара веснавых палявых работ, пара веснавой сяўбы, рашаючая лёс усяго сельскагаспадарчага года. Веснавы дзень—год корміць,—гаворыць народная пагаворка. Таму калгасная вёска зараз рыхтуе дастойную сустрэчу большэвіцкай вясне.

Перадавыя калгасы нашай вобласці пасіяхова ўжо завяршаюць падрыхтоўчыя работы да пачатку палявых работ. Калгас імені Сталіна, Мехаўскага раёна, у асноўным ужо закончыў прадпасеўныя работы. Тут поўнасцю засыпана насенне і праверана на ўсходжасць, за звяннямі і брыгадамі замацаван сельскагаспадарчы інвентар, цяглавая сіла, складзен галавы вытворчы і рабочы пасяўны планы. Калгаснікі вакапілі ўжо 25 цэнтнераў мясцовых угнаенняў, вывезлі 750 возаў гною на палі.

Калгаснікі сельскагаспадарчай артэлі «Ларынаўка», Аршанскага раёна таксама вядуць пасіяхова ўсе падрыхтоўчыя работы да веснавой сяўбы, сустракаюць сяўбу ва ўсеўзброенні, рыхтуюцца да яе, як да баявой ваенна-гаспадарчай кампаніі. Члены гэтага калгаса склалі галавы вытворчы і рабочы пасяўны планы, засыпалі высокаякасным насеннем пасяўныя фонды, поўнасцю падрыхтавалі сельгасінвентар, вакапляюць і вывозяць на калгасныя палі ўгнаенне.

Цяжка пераацаніць значэнне своечасовай і ўзорнай падрыхтоўкі да сяўбы. Правядзенне самой сяўбы і ўсіх веснавых работ будзе звязана з радам цяжкасцей. І ўлаўне зразумела, што той, хто своечасова падрыхтуецца да веснавой сяўбы, правядзе веснавыя палявыя работы высокаякасна і пасіяхова.

На вялікі жаль, у радзе раёнаў і калгасаў справу падрыхтоўкі да сяўбы падмяняюць шумихай і балбатнёй,—трацяць дарэмна каштоўныя дні. Вось, напрыклад, у Суражскім раёне падрыхтоўчыя работы да прадпасеўных работ праходзяць недапушчальна дрэнна. Тут яшчэ не адрамантавана каля 600 плугоў, не абменена 1.830 цэнтнераў насення, у калгасах не арганізавана вывазка гною на палі.

У асобных калгасах Гарадоцкага раёна рамонт сельгасінвентару не арганізаван. У калгасах „Ударнік", Селішчанскага сельсовета „Першы Май", Маскаленяцкага сельсовета, рамонт інвентару вытвараў толькі на 20—30 процантаў. Кузні тут прастойваюць з-за адсутнасці вугалю. У выніку па калгасах раёна яшчэ не адрамантавана 760 плугоў.

Мы ўправе спытаць: на што спадзяюцца кіраўнікі ўказаных раёнаў, запягваючы падрыхтоўчыя работы да веснавой сяўбы?

На МТС калгасы ускладаюць вялікія надзеі. Высокаякасны рамонт трактарнага парка з'яўляецца адным з самых важных умоў пасіяховага правядзення веснавой сяўбы. А між іншым у радзе раёнаў рамонт трактараў працягвае адставаць ад устаноўленых урадам тэрмінаў. У Межынскай МТС яшчэ на 50 процантаў не закончан рамонт трактарнага парка. Такое-ж становішча і ў Бескатаўскай МТС. Усямернае павелічэнне тэмпаў рамонту трактараў—адна з самых адказных задач у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Вялікую ролю ў хутчэйшым завяршэнні падрыхтоўчых работ да пачатку веснавой сяўбы павінен адыграць ваш раённы друк. Трэба, каб кожная раённая газета шырока асвятляла ход падрыхтоўкі да сяўбы, рашуча ўскрывала на сваіх старонках усе недахопы, якія тармазяць і перашкаджаюць хутчэйшаму завяршэнню падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, папулярызіравала вопыт перадавікоў, шырока прапагандыравала агратэхнічныя матэрыялы.

Пачатак веснавых работ не за гарамі. Трэба памятаць, што цяпер кожны дзень дораг. Нельга траціць часу ні на засыпцы насенных фондаў, ні на абмене насення, ні на рамонце сельгасінвентару і трактарнага парка.

Калгаснае сялянства, натхнёнае гістарычнымі перамогамі на франтах Айчыннай вайны, прыкладае ўсе свае сілы, каб пасіяхова правесці веснавую сяўбу, як мага больш атрымаць ураджай.

Справа гонару кожнага камуніста і комсамольца, кожнай партыйнай арганізацыі ва вёсцы арганізаваць калгаснікаў і работнікаў МТС на хуткае і высокаякаснае завяршэнне ўсіх падрыхтоўчых работ да пачатку веснавой сяўбы.

Унядраць метад Егора Агаркова

На загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна, прысвечаны 27-й гадавіне Чырвонай Арміі, працоўныя тыла адказваюць новымі вытворчымі перамогамі.

Калгаснікі і работнікі лясной прамысловасці Мехаўскага раёна ў часць наступаючых войск датэрмінова выканалі план I квартала па нарыхтоўках і вывазцы лесу.

Адзіная комсамольска-маладзёжная змена Віцебскага чыгуначнага вузла выканала заданне па абароту вагонаў на 133 процанты, па выгрузцы—на 130 процантаў і здачы вагонаў—на 104 процанты.

Лепшыя стаханаўцы фабрыкі „Сцяг Індустрыялізацыі" тт. Бялевіч, Багданава і Рыбакова, працуючы на масавым пашыве бялізны і адзення для працоўных, выконваюць нормы на 250—300 процантаў.

Растуць рады стаханаўцаў. Прышоўшыя нядаўна на вытворчасць навічкі ператвараюцца ў кваліфіканых рабочых. Накапілі вялікі вопыт брыгадзіры, майстры начальнікі ўчасткаў, змен, цэхаў. Усё гэта стварае цвёрдую глебу для яшчэ больших вытворчых поспехаў.

Аднак, рад прадпрыемстваў вобласці—асабліва мясцовай прамысловасці—маючы выдатныя паказчыкі прадукцыйнасці працы асобных стаханаўцаў, участкаў або цэхаў, у цэлым вытворчых планаў не выконваюць толькі таму, што не могуць забяспечыць усе ўчасткі работы кваліфікаванымі кадрамі.

У вырашэнні гэтага пытання магло б аказаць істотную і рашаючую дапамогу прымяненне на гэтых прадпрыемствах метада брыгадзіра франтавой брыгады завода бронекорпусаў Егора Агаркова. Метад Егора Агаркова з'яўляецца новым у стаханаўскім руху і аснаван на ўзбуйненні дробных брыгад і ўчасткаў, што дазваляе вызваліць частку работнікаў і з меншай колькасцю майстраў і рабочых выконваць план. Такім чынам, вызваленую кваліфікаваную сілу з поспехам магчыма выкарыстаць на іншых адстаючых участках, дзе не хапае спецыялістаў. На жаль, ні на адным з дробных і буйных прадпрыемстваў Віцебска метад Егора Агаркова не ўнядраецца. Горш таго, як прышлося ўстанавіць кіруючыя работнікі завода імені Кірава і начальнік 1-га будаўнічага ўчастка Пражывальскі, інжынер Юшкоўскі і прараб аднаго з аб'ектаў завода Омелькін, да гэтага часу нічога не чулі і не ведалі аб Егоры Агаркове, ні аб яго метадзе. Нічога не ведала аб гэтым і Юзеніч—начальнік будаўнічага ўчастка завода „Комінтэрн".

Падобнае становішча нецярпіма. Метад работы Егора Агаркова абавязан стаць дастаяннем усіх прамысловых прадпрыемстваў вобласці і патрабуе ад гаспадарчых кіраўнікоў і мясцовых партыйных арганізацый сур'ёзнай работы па паляпшэнню арганізацыі вытворчасці.

Трэба зараз-жа прыступіць да правядзення перагляду арганізацыйнай структуры вытворчасці і, там, дзе гэта магчыма, смялей пераходзіць да ўзбуйнення брыгад, участкаў і цэхаў. Прычым, да правядзення гэтых мерапрыемстваў неабходна прыцягнуць грамадскасць і інжынерна-тэхнічныя сілы пад кіраўніцтвам гаспадарчых кіраўнікоў і партыйных арганізацый.

Унядрэнне метада Егора Агаркова ва многіх галінах прамысловасці вашай вобласці дасць магчымасць многім прадпрыемствам яшчэ вышэй павялічыць прадукцыйнасць працы і да канца выканаць свой абавязак перад Радзімай—дапамагчы Чырвонай Арміі хутчэй разграміць фашысцкую Германію.

Выданне загада таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Чырвонай Арміі на таджыкскай, узбекскай і рускай мовах

СТАЛІНАБАД, 13 сакавіка. (ТАСС). Таджыкскае дзяржаўнае выдавецтва выпусціла з друку асобнай брашурай загад таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Чырвонай Арміі на таджыкскай, узбекскай і рускай мовах.

СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА ГОРАДА ВІЦЕБСКА

12 сакавіка адбываўся сход партыйнага актыва горада Віцебска.

Пад бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты сходам выбіраецца ганаровы прэзідыум у саставе членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З дакладам аб выніках VI Пленума ЦК Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі і задачах Віцебскай партарганізацыі выступіў сакратар Віцебскага абкома і гаркома КП(б)Б тав. Кудраеў. Ён расказаў аб разгледжаных Пленумам пытаннях і падкрэсліў, што галоўным вынікам VI Пленума Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б з'яўляецца мабілізацыя ўвагі на хутчэйшае выкананне задач, пастаўленых у дакладзе сакратара ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка і ў рашэннях Пленума па аднаўленню гаспадаркі БССР і ліквідацыі вынікаў нямецкай акупацыі.

Дакладчык падрабязна спыняецца на асобных пытаннях работы абласных, гарадскіх і раённых партыйных, совецкіх і гаспадарчых органаў і іх кіраўнікоў у свеце ацэнкі і задач, вынікаючых з рашэнняў VI Пленума ЦК КП(б)Б.

— У гэтай ацэнцы,—гаворыць ён,—мы, як у люстры, бачым сваю, павінен прама сказаць, дрэнную работу па аднаўленню прамысловасці, у асаблівасці прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі.

Нельга сказаць, што намі нічога не зроблена. Асобныя прадпрыемствы рэспубліканскага падпарадкавання ўжо часткова працуюць. Але гэтыя працуючыя прадпрыемствы ўстаноўленыя ім планы выпуску прадукцыі ў 1944 г. не выканалі, не дадаўшы краіне прадукцыі на суму каля 2 мільёнаў рублёў.

Вельмі дрэнна ідзе аднаўленне і работа прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі.

Не гледзячы на ўсе цяжкасці вайны, партыя і ўрад адпускаюць нам дзесяткі мільёнаў рублёў на аднаўленне разбуранай гаспадаркі. Аднак, у мінулым годзе прадпрыемствы нашай вобласці не выкарысталі каля 3-х мільёнаў адпушчаных ім сродкаў. За два месяцы гэтага года па гораду Віцебску выкарыстана толькі 25 процантаў к адпушчаным сумам на першы квартал.

Датычачыся пытання аднаўлення нашых вядучых прадпрыемстваў, у тым ліку саюзнага падпарадкавання, дакладчык указвае, што тэмпы аднаўлення іх нельга прызнаць здавальняючымі.

— Асабліва нездавальняюча праходзіць работа па аднаўленню Белдрэса, Асінторфу, і даволі слаба ідзе аднаўленне прадпрыемстваў станкабудаўніцтва.

У справе аднаўлення станкабудаўнічых заводаў і ў асаблівасці ўводу ў эксплаатацыю завода заточных станкоў—тут галоўная задача, якую мы павінны неадкладна рашыць, гэта забеспячэнне гэтых заводаў электраэнергіяй.

—Гаворачы аб іншых галінах прамысловасці,—гаворыць тав. Кудраеў,—Пленум Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б вызначыў канкрэтныя задачы і аб'ём работ, патрабуючыя ад партыйных і совецкіх арганізацый самай неаслабнай увагі і мабілізацыі ўсіх сіл і магчымасцей для пасіяховага выканання ўстаноўленых для нашай вобласці планаў.

Дакладчык падвяргае рэзкай крытыцы асобных кіраўнікоў, праяўляючых прамую безадказнасць у выкананні даручанай ім справы, у прыватнасці кіраўнікоў фабрыкі „Чырвоны Кастрычнік". Тут на працягу 5—6 месяцаў не могуць арганізаваць нават індывідуальнага пашыву абутку пры наяўнасці матэрыялаў і абсталявання. Віцебскі мясакамбінат (дырэктар т. Нілаў) на ўтрыманне штата расходваў ужо да 100 тысяч рублёў, а каштоўнасць усёй прадукцыі, выпушчанай гэтым прадпрыемствам за 8 месяцаў складае ўсяго 23 тысячы рублёў.

Тав. Кудраеў спыняецца на пытаннях работы чыгуначнага, рачнога і аўтадарожнага транспарта і сувязі. Ён адзначае, што за работу ў лютым месяцы Віцебскае чыгуначнае аддзяленне і станцыя Віцебск у спаборніцтве прадпрыемстваў па Заходняй чыгунцы занялі першае месца. Адначасова дакладчык указаў на некаторыя недахопы ў рабоце і на вельмі сур'ёзныя недахопы па рачному і аўтадарожнаму транспарту, асабліва па сувязі. Кіраўнікі прадпрыемстваў сувязі рашучых мер да паляпшэння эксплаатацыйнай работы сувязі не прымаюць, зусім недастатковымі тэмпамі вядзецца работа па тэлефанізацыі сельсоветаў, асабліва МТС і соўгасаў.

Дакладчык спыняецца на некаторых пытаннях работы гандлёвых арганізацый і ў асаблівасці спажывецкай кааперацыі.

Далей тав. Кудраеў гаворыць аб рыбнай гаспадарцы, аб тым, кab былі выкарыстаны спрыяльныя магчымасці, якімі разлічвае наша вобласць—гэта арганізаваць шырокі ўлоў рыбы. Ён рэзка крытыкуе дырэктара рыбтрэста т. Суханава і другіх работнікаў трэста за безініцыятыўнасць.

—Законна запытаць дырэктара рыбтрэста т. Суханава,—гаворыць дакладчык,—калі-ж прадпрыемствы рыбтрэста пачнуць нармальную работу і ці доўга яшчэ работнікі трэста будуць спасылацца на ўсякага роду непаладкі і прычыны, якія ставяць іх у разрад вельмі безініцыятыўных работнікаў.

Дакладчык завастрае ўвагу актыва на пытанне аднаўлення жылога фонда і ў асаблівасці адбудовы жылых дамоў калгаснікаў. Ён гаворыць аб вялікіх рэальных магчымасцях прымянення цэглы пры пабудове жылых, вытворчых і грамадскіх будынкаў на сяле і ў гарадах.

Далей дакладчык спыняецца на задачах у галіне паляпшэння арганізацыйна-партыйнай работы.

Вялікае месца ў сваім дакладзе тав. Кудраеў прысвяціў пытанню палітычнай работы сярод насельніцтва.

— VI Пленум Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б,—гаворыць ён,—вельмі вялікую ўвагу ўдзяліў пытанням масава-палітычнай і культурна-асветнай работы ў масах і арганізацыі ідэйна-палітычнага выхавання кіруючых кадраў дзяржаўнага апарата і інтэлігенцыі.

Сур'ёзным недахопам у пастаноўцы агітацыйна-прапагандысцкай работы, напрыклад, у абласным цэнтры—у Віцебску з'яўляецца тое, што партыйныя арганізацыі горада слаба вядуць масава-палітычную работу на прамысловых прадпрыемствах і чыгуначным транспарце, не ўлічваюць змяненняў, адбыўшыхся ў саставе рабочых за час Айчыннай вайны, і таго факта, што на прамысловыя прадпрыемствы зараз прыходзяць новыя людзі ў сваёй большасці жанчыны, моладзь, не прайшоўшыя яшчэ школу рабочага выхавання.

Некаторыя партыйныя работнікі забываюць, што першаступеннай задачай у рабоце партыйных арганізацый з'яўляецца выхаванне гэтых кадраў у духу соцыялістычных адносін да працы, да грамадскай уласнасці, найстражэйшага захавання дзяржаўнай дысцыпліны.

Ў заключэнне свайго даклада тав. Кудраеў выказвае ўпэўненасць, што мабілізуючы сілы ўсіх працоўных нашага горада і вобласці, Віцебская абласная і гарадская партыйная арганізацыя, пераадольваючы ўсякага роду цяжкасці і пры любых умовах з задачамі, пастаўленымі перад ёй VI Пленумам Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б—справіцца.

Па дакладу тав. Кудраева разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Начальнік Віцебскага аддзялення Заходняй чыгункі Герой Соцыялістычнай Працы тав. Макараў расказаў аб вялікай рабоце, праведзенай калектывам чыгуначнікаў па аднаўленню вузла.

—Усе дробныя і частку сярэдніх аб'ектаў,—гаворыць тав. Макараў,—нашы гаспадарнікі аднаўляюць уласнымі сіламі. Гэта значна паскорыла ход работ і дало магчымасць павялічыць перавозкі і палепшыць усю работу вузла. Калі ў мінулым годзе наша аддзяленне займала ў спаборніцтве 7—8 месца, то ў студзені і лютым Віцебскія чыгуначнікі занялі першае месца па Заходняй чыгунцы.

Служба аддзялення значна знізіла брак, але гэта яшчэ не значыць, што ён поўнасцю ліквідаван. Партыйным арганізацыям вузла прыдзецца прыкласці яшчэ многа намаганняў, каб канчаткова ліквідаваць брак у рабоце.

Да вайны прадпрыемствы Віцебска скарыстоўвалі эфектыўна торф для ацяплення і вытворчых мэт. Зараз торфазавод імені Баумана не працуе. Неабходна прыняць дзейсныя меры для яго аднаўлення і пуску ў эксплаатацыю.

Тав. Макараў прыводзіць рад фактаў безгаспадарчых адносін з боку кіраўнікоў асобных прадпрыемстваў да прыбываючых грузаў. Каштоўнае абсталяванне, паступіўшае ў адрас завода імені Кірава, на працягу двух месяцаў ляжыць пад адкрытым небам і псуецца. У такім-жа становішчы знаходзіцца і частка сельскагаспадарчага інвентару, у якім калгасы вобласці адчуваюць вялікую патрэбу. Не скарыстоўваецца яшчэ і абсталяванне электрастанцыі, не гледзячы на тое, што горад Віцебск і яго прамысловыя прадпрыемствы не маюць электраэнергіі.

Аб ходзе аднаўленчых работ на фабрыцы імені Кагановіча гаварыў у сваім выступленні дырэктар тав. Кічыгін. Калектыў фабрыкі з вялікім энтузіязмам працуе на будаўніцтве. Адпушчаныя сродкі ў мінулым годзе поўнасцю асвоены. Створаныя жаночыя будаўнічыя брыгады поўнасцю сябе апраўдалі і значна дапамагаюць у правядзенні аднаўленчых работ. У канцы лютага фабрыка атрымала ад наркамата праектнае заданне, што дазволіць зараз больш шпаркімі тэмпамі распачаць аднаўленчыя работы.

Тав. Кічыгін узняў пытанне аб неабходнасці арганізаваць выраб аконных і дзверных рам і іншай будаўнічай арматуры. Трэба вызначыць месца здабычы граверу, камня, вырашыць пытанне аб бесперабойнай дастаўцы паліва, забеспячэння прадпрыемстваў вадой і электраэнергіяй, устанавіць тэлефоны і радыё, каб лепш задавольваць патрэбы калектыва работнікаў фабрыкі.

Старшыня выканкома Чыгуначнага раённага Совета дэпутатаў працоўных тав. Сямёнаў падвергнуў рэзкай крытыцы работу горсовета і гарадскога аддзела комунальнай гаспадаркі, якія не кіруюць аднаўленчымі работамі.—Аднаўленне горада,—гаворыць тав. Сямёнаў,—праходзіць самацёкам. Горсовет і горкамгас зусім не цікавяцца, у якіх месцах індывідуальныя забудоўшчыкі і асобныя прадпрыемствы пачынаюць будаваць дамы, не ўлічваюць пытанні планіравання і рэканструкцыі горада. Яны вельмі марудна афармляюць водпуск дзелавой драўніны, што затрымлівае разгортванне будаўнічых работ. Вакол горада, у прыватнасці на ўзбярэжжы Дзвіны, ёсць многа вапняных залежаў, якія не выкарыстоўваюцца. Неабходна арганізаваць здабычу і апал вапны для задавальнення патрэб будаўніцтва.

Тав. Сямёнаў звяртае ўвагу на ўпарадкаванне адводу зямельнай плошчы для падсобных гаспадарак і індывідуальных гародаў. — Рабочым і служачым Чыгуначнага раёна, — гаворыць ён, — патрабуецца больш 600 гектараў зямлі пад індывідуальныя гароды. Гэтая плошча павінна быць адведзена паблізу горада, каб рабочыя і служачыя змаглі пасля работы папрацаваць на сваіх гародах. А на практыцы атрымалася, што бліжэйшыя ўчасткі адведзены падсобным гаспадаркам, а індывідуальным гароднікам прыдзецца хадзіць за 8—10 кілометраў.

—Пленум ЦК КП(б)Б,—гаворыць сакратар Першамайскага райкома партыі тав. Смірноў,—адзначыў сур'ёзныя недахопы ў кіраўніцтве партыйных і совецкіх арганізацый справай аднаўлення прамысловасці, сельскай гаспадаркі, а таксама ў пастаноўцы арганізацыйнай і партыйна-масавай работы. Гэтыя недахопы ёсць і ў нас. Прадпрыемствы раёна (за выключэннем фабрыкі „КІМ" і імені Кагановіча) у 1944 годзе не асвоілі адпушчаныя сродкі на капіталаўкладанне, а ў першым квартале гэтага года адпушчаныя сродкі яшчэ нідзе не скарыстоўваюцца. Больш таго, на прадпрыемствах раёна вяма яшчэ тэхнічнай дакументацыі, тытульных спісаў, праектаў, каштарысаў.

Кіраўнікі асобных прадпрыемстваў, як мясакамбіната — тав. Нілаў, малаказавода — тав. Бесавонаў — вышукваюць розныя аб'ектыўныя прычыны, каб апраўдаць сваю бяздзейнасць, а практычна нічога не робяць для арганізацыі выпуску прадуктаў харчавання.

—Нашы гаспадарнікі,—гаворыць далей тав. Смірноў,—скардзяцца на недахоп кваліфікаваных рабочых, а практычна ні на адным прадпрыемстве не выканана заданне па падрыхтоўцы рабочых масавых будаўнічых прафесій. На курсах масавых кваліфікацый у раёне абучаецца 77 процантаў патрэбнай колькасці. Фабрыка „КІМ" павінна да 1 мая падрыхтаваць 100 чалавек, а на курсах абучаюцца толькі 44 чалавекі. Такое становішча і на іншых прадпрыемствах. Кіраўнікі асобных прадпрыемстваў не праяўляюць ініцыятывы ў правядзенні падрыхтоўчых работ да скарыстання электраэнергіі, якая ў бліжэйшы час будзе прадастаўлена гораду. На фабрыках „КІМ", імені Кагановіча і іншых не праводзяцца электрамантажныя работы, адсутнічае провад і іншае неабходнае абсталяванне для прыёмкі току.

Тав. Смірноў указвае, што на тэрыторыі Першамайскага і Чыгуначнага раёнаў пракладзена каналізацыя, але яе эксплаатацыя не арганізавана з-за адсутнасці кампрэсараў і насосаў. Насельніцтва і прамысловасць гэтых раёнаў не забяспечаны вадой. З наступленнем вясны адсутнасць добраякаснай вады можа выклікаць розныя захворванні. Між тым гарадскі совет і водаканалбуд ніякіх мер не прымаюць для набыцця насосаў і кампрэсараў, каб выкарыстаць каналізацыйную сетку.

Пытанням арганізацыі масава-палітычнай работы сярод насельніцтва, ідэйна-тэарытычным і палітычным выхаванні кадраў партыйных, совецкіх, комсамольскіх работнікаў і інтэлігенцыі прысвяціў сваё выступленне загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі гаркома КП(б)Б тав. Корнеў. Ён указаў, што ў горадзе створаны і працуюць 57 агіткалектываў, якія налічваюць 507 агітатараў. Толькі ў студзені і лютым сіламі агітатараў праведзена каля 4.000 гутарак і чытак на розныя тэмы, на якіх прысутнічала 81.040 чалавек. Агітатары 10-й дыстанцыі пуці і кіраўнік агіткалектыва тав. Окаркаў рэгулярна інфарміруюць рабочых аб падзеях на франтах Айчыннай вайны і за рубяжом, расказваюць аб вопыце і метадах працы лепшых стаханаўцаў. І ў тым, што калектыў дыстанцыі заняў першае месца ў спаборніцтве нямалая заслуга агітатараў. Дарожны майстар 1-га акалотка агітатар тав. Страшук сістэматычна працуе над павышэннем ідэйна-палітычнага ўзроўню. Ён дабіўся стопроцантнага ахопу спаборніцтвам усіх рабочых свайго акалотка. Аб выніках выканання ўзятых абавязацельстваў ведаюць усе рабочыя. Добрая арганізацыя спаборніцтва і агітацыйна-масавая работа дала станоўчыя вынікі: 90 процантаў працуючых тут з'яўляюцца стаханаўцамі і ўдарнікамі.

Разам з гэтым тав. Корнеў адзначае, што сярод калектываў завода імені Кірава, паравознага дэпо, трэста сталовых і рэстаранаў, а таксама хатніх гаспадынь і інвалідаў Айчыннай вайны агітацыйна-масавая работа не разгорнута. Сакратары партыйных арганізацый тав. Канстанцінаў, Фельдман і другія не ўдзяляюць гэтаму належнай увагі.

Пры гарадскім і раённых камітэтах партыі створаны групы дакладчыкаў, у састаў якіх уваходзіць 118 чалавек. Але рэгулярна выступаюць з палітычнымі дакладамі толькі 56 чалавек. Астатнія таварышы ні разу не выступалі з дакладамі перад масамі, як тт. Абразевіч, Кочараў, Максімовіч і другія.

Не наладжана яшчэ як следуе работа раённых і гарадской партыйных школ. Часта зрываюцца заняткі ў школе Першамайскага раёна, дзе ў часы заняткаў праводзяцца паседжанні бюро, розныя нарады. Асобныя кіруючыя работнікі не займаюцца ў школах і не вывучаюць тэорыю марксізма - ленінізма. Так кіраўнік трэста сталовых і рэстаранаў тав. Яблакаў і другія палітычна непісьменныя, не могуць адказаць на самыя элементарныя палітычныя пытанні. Таму і ў гэтых калектывах масавая работа не арганізавана.

У спрэчках таксама выступілі тт. Галаскоў—упраўляючы абласной канторай Дзяржбанка, Леончанка—начальнік абласнога ўпраўлення працоўных рэзерваў, Ксяндзоў—сакратар Чыгуначнага райкома КП(б)Б, Ермашэнка—старшыня облвыканкома і другія.

У канцы схода з вялікай прамовай выступіў цёпла сустрэнуты ўдзельнікамі схода партыйнага актыва сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка, які паставіў перад большэвікамі Віцебшчыны рад канкрэтных задач па аднаўленню разбуранай нямецкімі акупантамі народнай гаспадаркі і горада Віцебска і паляпшэнню добрабыту працоўных.

Сход партыйнага актыва прыняў разгорнутую пастанову, накіраваную на няўхільнае выкананне рашэнняў VI Пленума ЦК КП(б)Б.

З вялікім уздымам, пад доўга незмаўкаючыя апладысменты сход партыйнага актыва прыняў прывітальнае пісьмо правадыру народаў—Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Маршалу Совецкага Саюза таварышу Сталіну.

Ад Совецкага Інформбюро

Аператыўная зводка за 15 сакавіка

На працягу 15 сакавіка на паўднёвы-захад ад Кенігсберга войскі 3-га Беларускага фронта, прадаўжаючы наступленне, вышлі на ўзбярэжжа заліва Фрыш Гаф і занялі насялёныя пункты Вангіт, Дзюмпелькруг, Пілнау, Албенен, Айнзам. Насялёны пункт Хайдэ Вальдбург, які размешчан у 8 кілометрах на паўднёвы-захад ад Кенігсберга, некалькі разоў пераходзіў з рук у рукі і зноў занят нашымі войскамі. Такім чынам, з выхадам на ўзбярэжжа заліва Фрыш Гаф нашы войскі расчлянілі ўсходне-прусскую групу войск немцаў на дзве часткі. Адначасова войскі фронта занялі насялёныя пункты Кобельбудэ, Золэкеу, Первільтэн, Варгітэн, Кемерсхофен, Альбенорд, Грунвер, Альбенен, Бладзіау, Грос Рэцэрсдорф, Шэрпдэ, Мірынхээ, Хермсдорф, Кальвальдэ, Айзенберг, Фрыдрыхсруэ, Фрыдхеўхэн, Фогельзанг і чыгуначную станцыю Кобельбудэ. У баях за 14 сакавіка ў гэтым раёне ўзяга ў палон больш 1.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

У Кольбергу прадаўжаліся баі па знішчэнню гарнізона праціўніка, блакіраванага ва ўсходняй частцы горада.

У Венгрыі, на паўночны-ўсход і ўсход ад возера Балатон нашы войскі адбівалі атакі пяхоты і танкаў праціўніка. У баях за 14 сакавіка агнём нашай артылерыі знішчана і падбіта 50 нямецкіх танкаў і самаходных гармат.

На другіх участках фронта—баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 14 сакавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 90 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 18 самалётаў праціўніка.

* * *

Удар нашай авіяцыі па чыгуначнаму вузлу і аэрадрому Веспрэм у Венгрыі

У ноч на 15 сакавіка нашы цяжкія бамбардыроўшчыкі нанеслі ўдар па чыгуначнаму вузлу і аэрадрому Веспрэм у Венгрыі. У выніку бамбардыроўкі на чыгуначным вузле і аэрадроме ўзніклі пажары, якія суправаджаліся ўзрывамі.

* * *

Ва Ўсходняй Прусіі, на паўднёвы-захад ад Кенігсберга, нашы войскі прадаўжалі наступленне. Упорныя баі адбыліся ў раёне апорнага пункта нямецкай абароны Хайдэ Вальдбург, які размешчан на ўзбярэжжы заліва Фрыш Гаф. Праціўнік, спрабуючы аднавіць сувязь паміж кенігсбергскім гарнізонам і групай сваіх войск, якая дзейнічае на паўднёвы-захад ад Кенігсберга, прадпрыняў рад жорсткіх контратак. Насялёны пункт Хайдэ Вальдбург некалькі разоў пераходзіў з рук у рукі. Сёння нашы войскі імклівым ударам зламалі варожае супраціўленне і на значным участку вышлі да заліва Фрыш Гаф. Асобныя групы немцаў, прыціснутыя да заліва, склалі зброю і здаліся ў палон. На другім участку савецкія часці ў выніку ўпорных баёў, пераходзіўшых у рукапашныя схваткі, занялі рад насялёных пунктаў. За дзень баёў знішчана звыш 4.500 салдат і афіцэраў праціўніка. Падбіта і спалена 29 нямецкіх танкаў і самаходных гармат, знішчана 108 палявых гармат, 50 мінамётаў і 280 кулямётаў. Нашымі байцамі захоплена ў немцаў многа ўзбраення і ваеннай маёмасці.

* * *

У Кольбергу нашы войскі вялі баі па ліквідацыі нямецкага гарнізона, блакіраванага ва ўсходняй частцы горада. Праціўнік контратакамі спрабуе ўтрымаць подступы да гавані, у якой знаходзіцца некалькі суднаў. Савецкія артылерысты патапілі нямецкі транспарт, які спрабаваў выйсці з гавані. Апрача таго, чатыры баржы падпалена запальваючымі снарадамі і патанулі. Штурмуючы будынкі, пераўтвораныя ў вузлы супраціўлення, нашы часці ачышчаюць ад гітлераўцаў адзін квартал за другім. Праціўнік нясе цяжкія страты. У выніку імклівай атакі занята чыгуначнае дэпо. Захоплена 10 паравозаў і 400 вагонаў з рознымі грузамі. Агнём пяхотнай зброі збіта 2 нямецкіх гідрасамалёты. Узята ў палон звыш 600 немцаў.

* * *

У Венгрыі, на паўночны-ўсход і ўсход ад возера Балатон, нашы войскі адбілі варожыя атакі. На адным участку немцы ўвялі ў бой да сотні танкаў і мотапяхоту. Пасля шматгадзіннага бою праціўнік быў адкінут на зыходны рубеж. На другіх участках гітлераўцы, сустрэнутыя артылерыйскім агнём, павярнулі назад, не дасягнуўшы нашых пазіцый. Стралковая рота старшага лейтэнанта Краснаслабодцава, адбіваючы варожыя атакі, знішчыла 3 нямецкіх танкі і да роты гітлераўцаў. Гарматны разлік гвардыі старшага сяржанта Мілаванава падбіў 3 варожых танкі. Радавы Барыс Яхантаў супрацьтанкавымі гранатамі падарваў два нямецкіх танкі. Сувязіст гвардыі сяржант Грыгорый Максіменка, справіўшы абрыў на лініі сувязі, вярнуўся ў сваё падраздзяленне. Ён заўважыў, што разарваўшыяся варожы снарад вывеў са строю разлік нашай гарматы. Максіменка падбег да гарматы і адкрыў агонь па праціўніку. Трапнымі выстраламі ён падбіў дзве нямецкіх самаходных гарматы.

* * *

Авіяцыя Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота атакавала судны праціўніка ў паўднёвай частцы Балтыйскага мора. Прамымі трапленнямі бомб патоплена 5 нямецкіх транспартаў, агульным водазмяшчэннем больш 30.000 тон.

* * *

Совецкае Інформбюро 1 сакавіка апублікавала загад камандуючага 2-й нямецкай арміяй генерал-палкоўніка Вейса аб мерах барацьбы супроць трусоў, дызертыраў і паражэнцаў. Ростам дызертырства занепакоен не толькі камандуючы 2-ой нямецкай арміяй. Падобныя-ж клопаты адалюючы і другіх нямецкіх генералаў. Днямі нашы войскі захапілі загад новага камандуючага паўночнай групай нямецкіх армій генерал-палкоўніка Рэнбурнц. У загадзе гаворыцца: „Усякі салдат, які ў ходзе баявых дзеянняў адбіўся ад свайго падраздзялення павінен зараз-жа прымкнуць да бліжэйшай часці ў зоне баёў. Такую часць лёгка знайсці ва ўсякі час па шуму бою. Салдат, не зрабіўшы гэтага, з'яўляецца дызертырам. Салдаты ўсіх родаў войск, затрыманыя ў насялёных пунктах, у абозах або сярод бежанцаў і заўляючыя, што яны нібы шукаюць сваю часць, падлягаць расстрэлу. Для неадкладнага разгляду спраў і безадкладнага прывядзення прыгавора ў выкананне ўстанаўліваюцца лятучыя ваенна-палявыя суды".

Нямецкія „лятучыя ваенна-палявыя суды" засядаюць дзень і ноч і пачкамі выносяць смертныя прыгаворы. І ўсё-ж яны не паспяваюць разглядваць усе справы аб дызертырстве. Таму нацысцкія афіцэры зачастую расстрэльваюць салдат без усякага суда і следства. Палонны салдат 234 палка 56 пяхотнай дывізіі Іозеф Думлінг расказаў: „22 чэрвеня ў нашым батальёне былі расстраляны без суда 15 нямецкіх салдат за тое, што яны пакінулі пазіцыі".

Сустрэча Героя Совецкага Саюза са сваімі землякамі

БЕШАНКОВІЧЫ. (Наш кар.). Нядаўна да сябе на радзіму—у калгас імені Варашылава, Бешанковіцкага сельсовета, прыязджаў Герой Совецкага Саюза, лётчык капітан Міхаіл Нікалаевіч Ткачонак. Калгаснікі арганізавалі свайму земляку - герою цёплую сустрэчу. Яны расказалі аб сваёй творчай працы на дапамогу Радзіме і фронту. Натхнёныя гістарычнымі перамогамі Чырвонай Арміі на франтах Айчыннай вайны працаўнікі сельскай гаспадаркі рыхтуюць большэвіцкую сустрэчу веснавой сяўбе. Уся іх праца накіравана на павышэнне ўраджайнасці калгасных палёў.

Міхаіл Нікалаевіч у сваю чаргу расказаў калгаснікам аб гераічных подвігах совецкіх воінаў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У чэсць прыезда героя калгаснікі рашылі пабудаваць яго маці новы дом. Быў арганізаван масавы суботнік. За адзін дзень калгаснікі нарыхтавалі і вывезлі для будаўніцтва дома 70 кубаметраў лесаматэрыялу. Зараз разгарнулася будаўніцтва.

Хутчэй і высокаякасна завяршым падрыхтоўку да веснавой сяўбы!

Давесці насенне да пасеўных кандыцый

„Што пасееш, то і пажнеш",— гаворыць мудрая народная пагаворка. Таму перадавыя калгасы, выканаўшы план засыпкі насенных фондаў, арганізавалі яго ачыстку ад пустазелля. Члены сельскагаспадарчай арцелі «Авангард», Чашніцкага раёна, згодна плана закончылі засыпку і ачыстку насенных фондаў, праверылі на ўсходжасць. Якасць насення добрая, поўчасцю адпавядае пасеўным кандыцыям. Своечасова закончылі ачыстку насення і праверку яго на ўсходжасць калгаснікі сельгасарцелі імені Чэлюскіна, Сіроцінскага раёна. Пры недахопе зерначышчальных машын калгаснікі арганізавалі ўручную адбор насення.

Між тым праверкай кантрольна-насенных лабараторый устаноўлена, што ў асобных калгасах і раёнах вобласці да ачысткі насення аднесліся не па-сур'ёзнаму. Насенныя фонды і на сённяшні дзень маюць вялікую засмечанасць. Па Сенненскаму раёну з ачышчаных 7.350 цэнтнераў амаль палова насення аказалася не кандыцыйным па засмечанасці пустазеллем.

У калгасе імені Кірава, гэтага-ж раёна, засыпана 31 цэнтнер ячменю. Пасля так званай ачысткі пры праверкі раённай кантрольна-насеннай лабараторыяй установлена, што ўвесь ячмень некандыцыйны па прымясях пустазелля. У адным кілограме гэтага ячменю налічваецца каля 10 тысяч насення пустазелля. Калі зрабіць пасеў такім насеннем аднаго гектара пры норме высеву 180 кілограм на гектар калгас уносе ў глебу не менш 1.800.000 насення пустазелля, гэтым самым значна панізіцца ўраджай і поле ператворыцца ў рассадник пустазелля. На пытанне: чаму дапушчана такая вялікая засмечанасць насенных фондаў? Старшыня калгаса тав. Макавецкі разважае:

— Бачыце, няма чым чысціць, вайна ўсё спіша...

Не знайшло такое разважанне, як бачна, належнага адпору і ў аграномаў раёна і кіраўнікоў райза. Яны супакоіліся тым, што зводкі аб ачыстцы насенных фондаў паступаюць рэгулярна, а як на месцы ў калгасах, брыгадах і звеннях рыхтуюць насенне да сяўбы іх гэта мала цікавіць.

Марудна ідзе ў калгасах раёна і абмен азімага жыта на недастаючыя яравыя культуры. Больш 6 тысяч цэнтнераў азімых яшчэ залежваецца ў калгасных кладовых, а вясна не за-гарамі.

Трэба прыняць усе меры, каб у кожным калгасе ў бліжэйшыя дні давесці насенныя фонды да пасеўных кандыцый, праверыць яго на ўсходжасць. Вялікую дапамогу ў гэтым павінны аказаць раённыя кантрольна-насенныя лабараторыі. Ні на адзін дзень нельга адкладваць абмен насення. Патрэбна мабілізаваць усіх калгаснікаў і цягло, шырока скарыстоўваючы кароў і зараз, калі яшчэ стаіць добрая санная дарога, поўнасцю зрабіць абмен азімых на яравыя культуры.

І. Арэхаў,
дырэктар абласной кантрольна-насеннай лабараторыі.



Соўгас імені Пюрупы. Уфімскага раёна, Башкірскай АССР, да 15 студзеня выканаў датэрмінова гадавы план рамонту трактараў і прыцэпнага інвентару пры высокай якасці работ. Рэстаўрацыя старых дэталяў і выраб новых запасных часцей рабіліся ва ўласных майстэрнях.

НА ЗДЫМКУ: лепшы механік рамонтнай брыгады соўгаса Г. Г. Сатскоў.

Узмацнілі тэмпы

ТАЛОЧЫН. (Наш кар.). Абмеркаваўшы пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год, калгаснікі сельгасарцелі „Новы быт", Славенскага сельсовета, узмацнілі тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Яны рашылі правесці яе ў сціслыя і лепшыя агратэхнічныя тэрміны і атрымаць у сярэднім з кожнага гектара пасеўнай плошчы не менш 12 цэнтнераў зернавых культур, 120 цэнтнераў бульбы, 5 цэнтнераў ільнавалакна і 4 цэнтнеры ільносемя.

Па ажыццяўленню пастаўленай задачы разгарнулася плённая работа. Звяно Шаркевіч вывезла на свой участак 14 тон гною, сабрала 5 цэнтнераў попелу, 1 цэнтнер птушынага памёту. Па яго прыкладу працуюць і астатнія 5 звенняў, якімі вывезена 55 тон гною, сабрана каля 20 цэнтнераў попелу і 5 цэнтнераў птушынага памёту. Накапленне і вывазку мясцовых угнаенняў прадаўжае кожная брыгада і звяно.

Старанна рыхтуецца да сяўбы насення. Ручную адсартыравана 80 процантаў насеннага фонда, накіравана ў кантрольна-насенную лабараторыю для праверкі на ўсходжасць. Калгаснікі нарыхтавалі ўжо 12 цэнтнераў вярхушак клубняў бульбы, у тым ліку 4 цэнтнеры—звяно т. Шаркевіч.

Вялікая ўвага звернута на падрыхтоўку да веснавых палявых работ коннага інвентару і вупражы. У калгасе адрамантавана 18 плугоў, 14 барон і 24 хамуты. Інвалід Айчыннай вайны К. Пятрушын навіў дастаткозую колькасць пастромак, лейцаў і гужоў, 70-гадовы калгаснік П. Пасюцін адрамантаваў 8 цялег. Калгасны конюх Марыя Іванова клапатліва даглядае за коньмі. Яна поўнасцю ліквідавала захворванне коней каростай. Зараз коні маюць сярэднюю і вышэй сярэднюю ўкормленасць.

Уся цяглавая сіла, а таксама інвентар і вупраж замацаваны за брыгадамі, звенняміі за асобнымі калгаснікамі.

Рыхтуючыся да веснавой сяўбы калгаснікі сельгасарцелі „Перамога", Талачынскага горсовета, паставілі перад сабой задачу адаўвіць былую славу калгаса, дабіцца ў гэтым годзе высокіх ураджаяў і тым самым аказаць дзейсную дапамогу нашай Чырвонай Арміі ў барацьбе з крывавым фашызмам.

У калгасе створана 11 паляводчых звенняў, якія шырока разгарнулі падрыхтоўку да вясны. Звенні распрацавалі свае выгворчыя планы і ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Кожнае звяно капіталіруе рамонт замацаванага за ім інвентару.

Паміж звенняміі шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Учарадзе ідзе звяно Вайчок Вэры, якое налічвае 9 чалавек. Гэта звяно ўжо сабрала 20 цэнтнераў попелу і 3 цэнтнеры курынага памёту. Наладжан збор попелу з установ і прадпрыемстваў раённага цэнтра. Звяно Лісоўскай Дуні сабрала каля 15 цэнтнераў попелу і 2 цэнтнеры курынага памёту.

На палі пад яравыя культуры ўжо вывезена больш 100 тон гною. Для павелічэння пасеўных матэрыялаў бульбы калгаснікі разгарнулі нарыхтоўку вярхушак клубняў бульбы. Ужо нарыхтавана каля 150 кілограмаў.

А. Баранаў.
Н. Мазурын.

За 700 гектараў на трактар

Жыва і па-дзелавому ў Першай Лепельскай МТС прайшло абмеркаванне звароту прапойскіх трактарыстаў.

У прынятых абавязацельствах калектыў МТС рашыў уключыцца ва Ўсебеларускае социялістычнае спаборніцтва, поўнасцю закончыць рамонг трактарнага парка і прыцэпнага інвентару да 1 красавіка, падрыхтаваць да пачатку палявых работ 30 кваліфікаваных трактарыстаў, выпрацаваць на кожны 15-сільны трактар не менш 700 гектараў у пераводзе на мяккую пахату, зэканоміць 8 процантаў гаручага і 4 процанты змазачных. Веснавую сяўбу правесці ў самыя сціслыя тэрміны з поўным захаваннем усіх агратэхнічных правіл.

У мэтах лепшага забеспячэння прадуктамі харчавання работнікаў машынна-трактарнай станцыі, дырэкцыя МТС абавязалася арганізаваць п а д с о б н у ю гаспадарку. П. Гардзіёнак.

Няма догляду за канём

У паспяховым правядзенні веснавой сяўбы вялікую ролю адыгрывае цяглавая сіла. Таму ўжо зараз неабходна прыняць клопаты аб падрыхтоўцы коней да гэтай важнейшай кампаніі. Але гэтага зусім не разумеюць кіраўнікі калгаса „Новы шлях", Віцебскага раёна. Тут коні ніжэй сярэдняй укормленасці, не замацаваны за ездавымі, не падагнана зброя. І, як вынік, у многіх коней, з-за драпежніцкіх адносін асобных калгаснікаў, пазбіты плечы і выведзены са строю.

Старшы конюх Соф'я Галавіна да свіх абавязкаў адносіцца абыякава. Корм выдаецца без уліку. І. М.

На рамонце інвентару

ЛЕПЕЛЬ. З раніцы да ночы ўпорна працуе каваль калгаса „Большэвік" Іосіф Казлоўскі. Ён датэрмінова і высокаякасна закончыў рамонт інвентару. Зараз Іосіф Казлоўскі разам з Егорам Дзівіным ужо адрамантавалі больш 20 плугоў і 15 барон суседняму калгасу „Чырвоны флот". Якасць рамонту добрая. В. Качан.

Парады агранома

ВЫКАРЫСТАЦЬ ТОРФ НА ЎГНАЕННЕ

Перад калгасамі і калгаснікамі Беларусі стаіць адказнейшая задача—аднавіць сельскую гаспадарку і дабіцца даваеннага ўзроўню ўраджаю з калгасных палёў. Нямецкія захопнікі знішчылі пагалоўе жывёлы, чым скарацілі накапленне гною, неабходнага для ўгнаення глебы.

У выпадку недахопу гною, яго можна замяніць торфам. Тарфянікі падзяляюцца на дзве групы: верхавыя або махавыя, і нізінныя або лугавыя. Верхавому торфу ўласцівы кіслыя якасці, харчовых матэрый ён мае менш, чым нізінны торф. Азоту ў нізінным торфе знаходзіцца не менш, чым у гної. Для таго, каб азот лепш засвойваўся раслінамі, торф павінен быць добра прасушан, праветран. Гэтым ён будзе пазбаўлен кіслот, якія шкодны для раслін.

Найлепшае выкарыстанне торфу—унясенне яго пад азімыя культуры з разліку 40—60 тон на гектар. Калі папаравае поле размешчана недалёка ад тарфяніка, мэтазгодна вывозіць торф адразу на поле. Торф трэба складваць у штабелі шырынёй не больш 1,5—2 метраў, або засыпаваць невялікімі кучкамі і пакідаць да аснаўнога ворыва папараў.

Ужыванне верхавога торфу ў чыстым выглядзе не рэкамендуецца. Гэты торф можа быць выкарыстан для закладкі кампосту. Найбольш каштоўныя тарфяныя кампосты робяцца з фасфарытнай мукі, вапнай, попелам, фекаліем.

Як прыгатаўляюцца тарфяныя кампосты?

Лепш за ўсё закладваць кампостныя кучы на высокім месцы, якое не заліваецца вадой, бліска ад поля. Для гэтага расчышчаецца пляцоўка і ўкладваецца торф слоем: шырынёй 1,5—2 метра, вышынёй 25—30 см. Гэты торф перасыпаецца фасфарытнай мукой, вапнай або попелам і старанна перамешваецца. Затым укладваецца другі слой торфу, перасыпаецца ўгнойваючымі матэрыямі і зноў перамешваецца. І так да таго часу, пакуль вышыня кучы не дасягне 1,5—2 метраў. Верх кучы робяць у выглядзе двухскатнага даха. На адну тону торфу патрабуецца 10—20 кілограмаў фасфарытнай мукі, попелу або вапны. Фекалій дабаўляецца ў торф у залежнасці ад віду торфу—да 5 частак.

На працягу лета кампостныя кучы неабходна 2—3 разы перапапачваць.

Кампост лічыцца спелым, калі разлажыўшаяся маса становіцца аднароднай і лёгка рассыпаецца.

Каб пазбегнуць перасыхання, трэба на працягу лета зрабіць паліўку кампостнай кучы вадой а-ю навознай жыжай.

Усе віды кампосту добра выкарыстоўваць пад яравыя і бульбу, для чаго патрабуецца вывезці кампост пад заблівае ворыва.

Дзейнічанне торфу і тарфянога кампосту прадаўжаецца некалькі гадоў.

Ст. агранам Наркамзема БССР—Кесарава.

Тэлеграма румынскага ўрада таварышу Сталіну

БУХАРЭСТ, 13 сакавіка. (ТАСС). Румынскі ўрад накіраваў таварышу І. В. Сталіну наступную тэлеграму:

„Яго Прэвасхадзіцельству, Старшыні Соўнаркома СССР Маршалу Сталіну.

Рашэнне Ўрада СССР задаволіць просьбу Румынскага Ўрада аб устанаўленні румынскай адміністрацыі ў Трансільваніі, вызваленай цаною гераічных ахвяр слаўнай Чырвонай Арміі пры садзеянні румынскай арміі, напоўніла сэрцы румынскага народа велізарнай радасцю. Санкцыяніруючы з'яднанне гэтай тэрыторыі з дэмакратычнай Румыніяй, рашэнне гэта з'яўляецца адным з самых каштоўных укладаў у справу ўмацавання дружбы і супрацоўніцтва паміж СССР і Румыніяй. Выказваем Совецкаму Ўраду і асабіста Вашаму Прэвасхадзіцельству глыбокае прызнанне Румынскага Ўрада і народа і нашу няўхільную волю давесці да канца сумесна са слаўнымі совецкімі і саюзнымі арміямі барацьбу за разгром агульных ворагаў".

Тэлеграму падпісалі прэм'ер-міністр Гроза і намеснік прэм'ер-міністра і міністр замежных спраў Татарэску.

Ваенныя дзеянні ў Заходняй Еўропе

ЛОНДАН, 14 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што войскі саюзнікаў на прадмостным умацаванні ля Рэмагена, на ўсходнім беразе Рэйна, прасунуліся амаль на 1.000 метраў у глыбіню германскай тэрыторыі, не гледзячы на ўпорнае супраціўленне праціўніка. Плошча прадмостнага ўмацавання зараз складае 7.2 кілометра ў глыбіню і каля 17 кілометраў па фронту. Прадаўжаюцца баі ў прадмесцях Гонефа і ў Гонінгене. Перадавыя часці саюзнікаў зараз знаходзяцца ў 4 кілометрах ад буйнейшай германскай аўтастрады.

Паласа тэрыторыі на паўночным беразе ракі Мозель паміж Трырам і Кобленцам, якая знаходзіцца ў руках немцаў, зараз звузілася да 6.4 кілометра. На ўсход ад Саарбурга саюзнікі прасунуліся ва ўсходнім напрамку на 4 кілометры і фарсіравалі раку Рувер. На працягу 12 сакавіка саюзнікі захапілі 5.416 палонных.

ЛОНДАН, 15 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што прадмостнае ўмацаванне саюзнікаў на Рэйне, ля Рэмагена, цяпер дасягае 8 кілометраў у глыбіню і расшырана ў паўночным напрамку прыкладна на 2 кілометры на паўночны-ўсход ад Гамнеха.

Пяхотныя часці саюзнікаў прасунуліся прыкладна на 5.5 кілометра на ўсход ад Лінца, пераадольваючы ўпорнае супраціўленне ворага. На паўднёвы-захад ад Трыра пяхотныя часці саюзнікаў прасунуліся прыкладна на 4 кілометры ва ўсходнім напрамку і занялі 4 гарады. На захад ад Саарбрукена саюзнікі перайшлі франка-германскую граніцу, пераправіліся праз раку Саар і занялі 6 гарадоў.

13 сакавіка саюзнікі захапілі 2413 палонных.

На працягу 14 сакавіка самалёты саюзнікаў рабілі налёты на нямецкія камунікацыі ў Галандыі, у заходняй Германіі, а таксама на ўсім працяжэнні фронта баявых дзеянняў.

ЛОНДАН, 15 сакавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што ў становішчы на ўчастках 5 і 8 арміі ў Італіі змен не адбылося.

Налёт англійскіх самалётаў на Берлін і Рэгенсбург

ЛОНДАН, 14 сакавіка. (ТАСС). Як паведаміла англійскае міністэрства авіяцыі, у ноч на 14 сакавіка англійскія бамбардыроўшчыкі „Маскіто" ў 21 раз падрад зрабілі налёт на Берлін.

Па паведамленню агенцтва Рэйтэр днём 13 сакавіка авіяцыя саюзнікаў зрабіла налёт на ваенныя аб'екты ў Рэгенсбургу, у 50 мілях на паўночны-ўсход ад Мюнхена. Бамбардыроўцы падвергнута чыгуначная сетка на вялікім участку паміж Рэгенсбургам і Мюнхенам, а таксама ля аўстрыйскай граніцы.

Дзеянні авіяцыі саюзнікаў

ЛОНДАН, 13 сакавіка. (ТАСС). Штаб амерыканскай стратэгічнай авіяцыі ў Францыі паведамляе, што прыкладна 1.350 „Лятаючых крэпасцей" і „Ліберэйтараў" падверглі бамбардыроўцы германскія ваенныя і ваенна-марскія аб'екты на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, а таксама 6 сартыровачных станцый у раёне паміж Франкфуртам на Майне і Рурам. Бамбардыроўшчыкі дзейнічалі ў суправаджэнні больш чым 750 знішчальнікаў. Прыкладна 650 бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на ваенныя аб'екты на германскім узбярэжжы Балтыйскага мора, а астатнія—на сартыровачныя станцыі.

Адказны рэдактар
А. С. КРУШЫНСКІ.

Ж23855

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Віцебск, вул. Валадарскага, 4. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—0—77. Адказнага сакратара—1—05.

Друкарня газеты „Віцебскі Рабочы". Тыраж 19 тыс. экз.